УДК 811.161.3'27:378.6

## Сацыялінгвістычны аспект выкладання беларускай мовы ў тэхнічных ВНУ

Шэмет Т.Я.
Інстытут мовы і літаратуры імя Я. Коласа і Я. Купалы НАН Беларусі

Беларуская мова – мова тытульнай нацыі, адна з дзяржаўных моў у Рэспубліцы Беларусь. Аб важнасці выкладання беларускай мовы ў вышэйшых навучальных установах краіны ва ўмовах сучаснага жыцця сведчаць даныя, атрыманыя ў выніку анкетавання студэнтаў БНТУ.

Па выніках анкетавання 198 студэнтаў другога года навучання факультэта інфармацыйных тэхналогій і робататэхнікі было ўстаноўлена, што сярод апытаных 88,7 % ніколі не выкарыстоўваюць беларускую мову ў якасці сродку зносін або выкарыстоўваюць яе вельмі рэдка, у выпадку крайняй неабходнасці. Амаль палова студэнтаў (40,4 %) адказалі, што карыстаюцца беларускай мовай у асноўным у сферы адукацыі, а значыць, на занятках, дзе выкладаюць па-беларуску. Пераважна на занятках па беларускай мове ва ўніверсітэце, беларускай мове і літаратуры – у школе

Беларускую мову называюць роднай толькі 29,8 % апытаных, у той час як рускую мову лічаць роднай 39,3 % (прычым 87 % ад гэтай колькасці – беларусы па нацыянальнасці). Абедзве дзяржаўныя мовы называюць роднымі 28,2 % апытаных.

Прыведзеныя лічбы дастаткова яскрава характарызуюць моўную сітуацыю ў краіне ў цэлым, выяўляючы характэрныя сацыялінгвістычныя тэндэнцыі. Колькасць людзей, якія перастаюць усведамляць нацыянальную мову як родную, няўхільна павялічваецца, і звязана гэта, найперш, са звужэннем сфер выкарыстання беларускай мовы.

Беларуская і руская мовы, з'яўляючыся дзяржаўнымі ў Рэспубліцы Беларусь, надзелены роўнымі правамі. Аднак на практыцы аказваецца, што адну з дзяржаўных моў увесь час даводзіцца абараняць. На думку Н.Б. Мячкоўскай, "для абароны беларускай мовы <...> патрэбныя не роўнасць правоў, а статус "найбольшага спрыяння" і вялікая дзяржаўная і грамадская праца па ажыццяўленню гэтага «спрыяння»" [1, с. 43]. У сувязі з гэтым выкладанне курса беларускай мовы ў тэхнічных ВНУ можна разглядаць не толькі як абавязковы кампанент нацыянальнай вышэйшай адукацыі краіны, але і як пільнае запатрабаванне сучаснага жыцця і адну з мер па папулярызацыі мовы сярод насельніцтва Беларусі.

Літаратура

1. Мячкоўская, Н.Б. Сацыялінгвістычны погляд на чыннікі, тармазы і прыярытэты нацыянальнага адраджэння / Н.Б. Мячкоўская // Мовы і культура Беларусі : Нарысы. – Мінск : Права і эканоміка, 2008. – С. 41-48.